*Д.П. Сергейчук,*
*аспірант кафедры педагогікі*
*сацыяльна-культурнай дзейнасці*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта*
*культуры і мастацтваў*

# БЕЛАРУСКАЯ НАРОДНАЯ ГУЛЬНЯ Ў ПРАЦАХ АЙЧЫННЫХ ДАСЛЕДЧЫКАЎ

На беларускую народную гульню ў розныя часы звярталі ўвагу вядомыя навукоўцы, педагогі і псіхолагі. А. Г. Кіркор разглядае народную гульню як з’яву культуры, элемент фальклорнай традыцыі народа. У працах С. Цярохіна, П. В. Шэйна, Я. Р. Вількіна, Е. Р. Раманава, М. Я. Нікіфароўскага грунтоўна аналізаваны матэрыялы фальклорнай спадчыны беларусаў – песні, абрады і гульні.

Карысным даследаваннем беларускай народнай гульні, але належна не заўважаным і не ацэненым дагэтуль, з’яўляецца праца Уладзіслава Казлоўшчыка «Аб фізічным выхаванні ў беларусаў» (Вільня, 1928). Аўтар асаблівае значэнне надае авалоданню гульцамі звесткамі пра традыцыі і звычаі сваіх продкаў, развіццю іх фізічнай і духоўнай сілы, «каб набыць свабоду і здзейсніць свае народныя і грамадскія летуценні». Робячы гістарычны экскурс у мінулае краю, даследчык звяртае ўвагу на старажытныя славянскія ігрышчы, на якіх адбываліся, як і ў грэкаў, дужанне, бокс, скокі і іншыя «святочныя справы» [10]. Аўтар выказвае меркаванне, што нашыя далёкія продкі сустракаліся з грэчаскай культурай і ведалі традыцыі старадаўніх алімпійскіх гульняў. Акрамя таго, ён звяртаецца да рыцарскіх традыцый беларусаў.

У больш позні перыяд даследчыкі займаліся паглыбленым вывучэннем беларускай народнай гульні і спрабавалі яе сістэматызаваць. Я.Р. Вількін, які ў 1970 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю «Беларускія народныя гульні другой паловы XIX – пачатку XX ст.», акрамя пытанняў аб гісторыі народных гульняў, іх арганізацыі і класіфікацыі, звяртаў увагу на вывучэнне фізічнай культуры беларусаў, даследаваў больш за 300 варыянтаў гульняў, запісаных у дарэвалюцыйны і ў савецкі час [5].

Народныя гульні і іх значэнне ў фізічным выхаванні даследавалі Я. Гелер, Л. Геркан, К. Кулінковіч. Але найбольш грунтоўна гэтая з’ява нацыянальнай культуры пададзена ў працы Я. Р. Вількіна «Беларускія народныя гульні» [6].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У дадзеным артыкуле разглядзім народныя гульні ў прызме традыцыйнай святочнай культуры беларусаў, падыходы да іх класіфікацыі. У працах спецыялістаў па народнай гульнёвай творчасці, такіх як А. Ю. Лозка, В. К. Бандарчык, К. П. Кабашнікаў, А. С. Фядосік, Л. І. Казлоўская, класіфікацыя складзена па функцыянальна-тэматычным і каляндарным прынцыпах [11]: 1) каляндарныя і сямейна-абрадавыя гульні (са святочна-абрадавай атрыбутыкай і без яе); 2) гульні, не звязаныя з народным календаром і абрадамі (ці згубілі сувязь). Да першай групы адносяцца каляндарныя і сямейна-абрадавыя гульні, якія з’яўляюцца найбольш кансерватыўным і архаічным пластом народнай спадчыны, у якім адметна захаваліся адбіткі міфалагічных уяўленняў чалавека, язычніцкіх культаў старажытнасці. Да другой групы адносяцца гульні, якія пад уплывам часу змянілі сваю функцыянальную накіраванасць. У іх пераважна дамінуе эстэтычны бок над магічным.

У выніку страчвання каляндарна-абрадавай сэнсавай прыналежнасці некаторыя абрадавыя гульні блукаюць паасобку ў скарбніцы народнай культуры.

Такім чынам сучасную сістэму народнай гульнятэкі можна прадставіць як дзве асноўныя групы гульняў: абрадавыя і пазаабрадавыя. Адштурхоўваючыся ад гэтай групоўкі, народныя гульні на сучасным этапе можна класіфікаваць па наступных прыкметах: 1) форме ўвасаблення гульні ў кантэксце мерапрыемства (традыцыйныя ігрышчы, народныя гулянні, гульнёвыя праграмы, гульнёвыя атракцыёны, гульні-забавы, гульні-пацешкі, гульнёвыя спаборніцтвы, спартландыі); 2) гендэрнай і ўзроставай прыналежнасці гульні (гульні для хлопчыкаў, дзявочыя гульні, змешаныя); 3) колькаснай характарыстыцы гульні (адзіночныя, парныя, групавыя, масавыя); 4) працягласці («гульні кароткай працягласці» (кароткачасовыя да 5 хвілін); «гульні сярэдняй працягласці» (да 30 хвілін); «гульні доўгай працягласці» (да гадзіны); «гульні неабмежаванай працягласці» (не маюць хронаметражу правядзення); 5) порах года і рэгіянальных асаблівасцях – зімовыя (абрадавыя ці пазаабрадавыя), веснавыя (абрадавыя ці пазаабрадавыя), летнія (абрадавыя ці пазаабрадавыя), восеньскія (абрадавыя ці пазаабрадавыя); 6) сямейна-бытавым характары (святочныя і паўсядзённыя, гульні вясельнага абрадавага комплексу, гульні родавой накіранаванасці, гульні эратычнай накіраванасці, гульні бытавога характару); 7) змесце і жанравых

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

асаблівасцях (інтэлектуальныя, пазнавальныя, драматычныя, танцавальныя, ролевыя, вакальныя, спартыўныя, змешаныя).

Гульня пранікае і суправаджае ўсе сферы жыццядзейнасці чалавека. Яна будзіць уя’ўленне, актывізуе фантазію, мабілізуе да набыцця новых ведаў. У гульні выхоўваюцца маральна-эстэтычныя якасці, агульначалавечыя каштоўнасці, развіваецца культура маўлення і камунікатыўных зносін, выхоўваюцца паважлівыя, гуманныя адносіны да іншых і да прыроды [13]. Гульня далучае да нацыянальнай культуры і гісторыі.

Адной з асноўных прыкмет любой гульні, па меркаванні П. А. Гуда, з’яўляюцца яе зместавыя абставіны, якія ствараюць умоўную сітуацыю для дзеяння з мэтай адаптацыі ў соцыуме, фарміравання камунікатыўнасці і пачуцця значнасці суіснавання ў калектыве. Гульнёвыя правілы, паводле думкі даследчыка, гэта, па сутнасці, умовы ўнутранага самавызначэння і самаабмежавання чалавека [8].

Разнавіднасці народных гульняў накіраваны не толькі на стварэнне атмасферы свята, але і на фізічнае і творчае выхаванне гульцоў і раскрыццё іх здольнасцей. Па меркаванні К. Л. Лабчэўскай, такія народныя гульні, як «Воранаўскі чыгун», «Брама», «Яшчар», накіраваны на развіццё арыентавання гульцоў на мясцовасці. У працэсе такіх гульняў удзельнік праяўляе актыўнасць, волю да перамогі, смеласць і знаходлівасць, выхоўвае цярпенне і павагу да іншых удзельнікаў гульні [9]. Да прыкладу, даследчык П. А. Гуд сцвярджае, што ў народнай гульні «Наезнік» выхоўваюцца спрыт, кемлівасць і ўвага. У гульнёва-абрадавым свяце «Масленкі» ў працэсе пераапранання, масавых дзей і імправізавана-тэатралізаваных пастановак, адзначае Л.І Казлоўская, адбываецца ўсебаковае раскрыццё асобасных здольнасцей гульцоў у розных іпастасях [11]. Выконваючы пэўную ролю, гулец стараецца ператварыцца ў вобраз прапанаванага яму персанажа, тым самым раскрывае новыя магчымасці для самарэалізацыі, фарміруе ўнутранае бачанне з улікам характарыстык гульнёвага вобраза. Цікава, што гульні з пераапрананямі ўдзельнікаў найбольш вабяць, працэс пераапранання, складання вобраза пры дапамозе пэўнага рэквізіту ўзбагачае фантазійныя ўяўленні, што дапамагае раскрыць вобраз і з поспехам выканаць дадзеную роль.

У сучаснай тэрміналогіі гульня трактуецца як святочная форма праявы культурна-мастацкай творчасці, адасоблены кампазіцыйна

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пабудаваны твор, у якім актывізацыя і актыўнасць гледачоў разглядаюцца як прадукт трансляцыі культурнай традыцыі народа [12]. Сёння для вырашэння праблемы эстэтычнага, патрыятычнага, экалагічнага, гендарнага, мастацкага выхавання ў працэсе гульнёвай дзейнасці створаны шматлікія метадычныя дапаможнікі для арганізатараў гульнёвай творчасці і педагогаў установ культуры і адукацыі. Аўтарамі такіх прац з'яўляюцца выдатныя навукоўцы, педагогі, псіхолагі: Н. Н. Шацкая на Брэстчыне, І. Р. Журлова – на Гомельшчыне, навукоўцы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя М. Танка, навуковыя супрацоўнікі Нацыянальнага інстытута адукацыі і г.д. Значны ўклад у развіццё сацыякультурнага праекта выхавання дзяцей і моладзі праз гульню ўнесла К. Л. Лабчэўская, тэарэтык, практык, вядомы ў Беларусі спецыяліст па гульнёвай дзейнасці, доўгі час працавала вядучым спецыялістам у галіне гульнёвай творчасці ў Інстытуце праблем культуры.

Заўважны ўнёсак у тэорыю, методыку і арганізацыю сацыякультурнай дзейнасці кандыдата педагагічных навук Л. І. Казлоўскай. У сваіх працах яна разглядае праблему выхавання моладзі ў працэсе гульнёвай дзейнасці, пошук новых тэхналагічных прыёмаў яе арганізацыі. Пад яе асабістым кіраўніцтвам на базе вядучай ВНУ у сферы культуры нашай краіны створана моцная навуковая школа па праблеме выкарыстання педагагічных магчымасцей гульні, складзена тэарэтыка-метадычная і метадалагічная база для падрыхтоўкі высокапрафесійных спецыялістаў па арганізацыі гульнёвай дзейнасці [11]. Праблемамі арганізацыіі беларускай народнай гульні падчас свят займаецца загадчык кафедры рэжысуры абрадаў і свят П. А. Гуд. Сумесна з абласнымі і рэспубліканскімі цэнтрамі нацыянальнай творчасці ім распрацавана і ўвасоблена шмат практыка-арыентаванай метадычнай літаратуры па арганізацыі гульнёвай дзейнасці [7].

Аналізуючы фальклорныя матэрыялы, навуковую і метадычную літаратуру па дадзенай тэме, адзначым актыўную цікавасць даследчыкаў да сацыякультурнага феномена гульні. Сёння шмат навукоўцаў скіроўваюць свой позірк на праблемнае поле выхавання народнай гульнёй, бо дагэтуль патэнцыял дадзенай культурнай з'явы не распрацаваны ў поўным аб'ёме. Рознабаковае асэнсаванне народнай гульні як фальклорнай традыцыі, аналіз і праблемы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выкарыстання яе ў сучаснай сацыякультурнай дзейнасці патрабуюць больш дэталёвага вырашэння і глыбокага асэнсавання.


*1. Беларускі* народны каляндар / А. Ю. Лозка. – 2-е выд., перапрац. – Мінск : Полымя, 2002.

*2. Беларускія* народныя танцы, карагоды, гульні / склад. В. С. Семеньякоў. – Мінск : БСЭ, 1989.

*3. Беларускі* фальклор : жанры, віды, паэтыка : у 6 кн. / рэдкал. : А. С. Фядосік [і інш.] ; АН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мінск : Беларус. навука, 2001. – Кн. 1.

*4. Беларускі* фальклор : хрэстаматыя : вучэб. дапам. для філал. фак. ВНУ / склад. К. П. Кабашнікаў, А. С. Ліс, А. С. Фядосік, І. К. Цішчанка. – Мінск : Выш. шк., 1996.

*5. Вилькин, Я. Р.* Белорусские народные игры второй половины XIX – начала XX в. : автореф. дис. … канд. ист. наук. – Минск, 1971.

*6. Вількін, Я. Р.* Беларускія народныя гульні / Я. Р. Вількін. – Мінск : Беларусь, 1996.

*7. Гуд, П. А.* Беларускае Купалле : кампазіцыя і семантыка абрадавых дзей / П. А. Гуд. – 2-е выд., стэрэатып. – Мінск : БДУКМ, 2006.

*8. Гуд, П. А.* Ад Каляд да Пакроў / П. А. Гуд. – Мінск : Красіка-Прынт, 2000.

*9. Гуд, П. А.* Тэхналогія стварэння свята : вучэб. дапаможнік / П.А. Гуд. – Мінск : БДУКМ, 2004.

*10. Гульні,* ігрышчы забавы / рэдкал. : А. С. Фядосік [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 2003.

*11. Казлоўская, Л. І.* Прафесійнае майстэрства арганізатараў гульнёвай дзейнасці дзяцей і моладзі / Л. І. Казлоўская // Сацыяльна-педагагічная работа, праблемы выхавання. – 2006. – № 1.

*12. Луцэвіч, Л. В.* Гульня ў кантэксце гендарнай сацыялізацыі / Л. В. Луцэвіч // Сацыяльна-педагагічная работа, праблемы выхавання. – 2006. – № 1.

*13. Самоукина, Н. В.* Организационно-обучающие игры в образовании / Н. В. Самоукина. – М. : Нар. образование, 1996.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ